# ГОРАДНЯ НА МАЛЮНКАХ НАПАЛЕОНА ОРДЫ

***Крыніца публікацыі:***
Горадня на малюнках Напалеона Орды [Электронны рэсурс] // Harodnia.com. – Рэжым доступу: https://harodnia.com/be/uczora/rasijskaja-impieryja/5-hrodna-na-maliunkach-ordy?showall=1&limitstart=. – Дата доступу: 20.07.2018 г.



**Якасная электронная падборка ўсіх вядомых сёння малюнкаў Напалеона Орды з выявамі Горадні, подпісамі да іх, а таксама фотаздымкамі з сучасным выглядам мясцін, намаляваных Ордам амаль 150 гадоў таму.**

Напалеон Орда (1807–1883) – выдатны кампазітар, мастак, педагог і пісьменнік, паходзіў з Палесся. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, адкуль быў выключаны за ўдзел у тайных студэнцкіх таварыствах. Пасля прымаў удзел у паўстанні 1830–31 гг. і вымушаны быў эміграваць у Францыю. Вярнуўся адтуль ён у 1856 годзе і ўжо ў 1860–1880-х гадах стварыў серыю сваіх знакамітых мастацкіх работ з выявамі гарадоў і мясцінаў Беларусі, Літвы і Польшчы. Сярод іх і каля 40 вядомых сёння малюнкаў з выявамі Горадні.

Усяго сёння вядома каля 1150 малюнкаў і акварэляў Напалеона Орды. З іх больш 1000 знаходзяцца ў Кракаве і Варшаве. Даволі значная колькасць таксама ў Вільні. У Беларусі захоўваюцца адно каляровыя літаграфіі з альбомаў, якія Орда за прыватныя грошы друкаваў у 1873–1883 гадах.

Аб побытах Орды ў Горадні сёння амаль нічога невядома. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ён жыў у нашым горадзе ў 1863–64 гг. Дакладна вядома, што з 15 мая 1866 па красавік 1867 г. Орда знаходзіўся ў гродзенскай турме, куды яго засадзілі

расійскія ўлады па падазрэнню ва ўдзеле ў паўстанні 1863 года. Адзін з малюнкаў Орды сапраўды зроблены з двара гродзенскага астрога. Але хутчэй за ўсё асноўную масу гарадзенскіх малюнкаў Орда стварыў ужо пад канец 1860-х ці нават у пачатку 1870–х гг. Гэта бачна таксама і па малюнках мастака, напрыклад, гарадзенскі чыгуначны вакзал быў дабудаваны ў 1867 годзе, таму раней намаляваць яго Орда не мог.

Вялікая каштоўнасць гарадзенскіх малюнкаў Напалеона Орды ў тым, што гэтыя выявы зроблены яшчэ перад тым, як горад масава пачалі фатаграфаваць прафесійныя фатографы. Сёння вядома літаральна некалькі фотаздымкаў Горадні 1860-х гг., ды і ўвогуле, фотаздымкаў горада, зробленых да пажара 1885 года, не так і шмат. Таму і цікавыя нам не толькі выявы манументальных помнікаў дойлідства, такіх як гарадзенскія касцёлы (хаця, напрыклад, гарадзенскі дамініканскі касцёл быў разбураны па загаду расійскіх уладаў літаральна праз пару год пасля таго, як яго намаляваў Орда), але і малюнкі шэраговай забудовы горада, паколькі яе характар цалкам змяніўся пасля пажара 1885 года. На змену драўляным фахверкавым будынкам тады прыйшлі цагляныя дамы, якія мы маем магчымасць бачыць сёння.

Варта звярнуць увагу і на тое, што Орда часта маляваў архітэктурныя помнікі, якія, магчыма, мелі дачыненне і да яго ўласнай біяграфіі. Напрыклад выявы вулачак з драўлянай забудовай на абодвух берагах Нёмана і дамоў маёнткавага тыпу, месцазнаходжанне якіх сёння цяжка лакалізаваць. Гэтыя будынкі маглі быць месцам пражывання сяброў мастака, у якіх ён жыў пад час візітаў у наш горад. У так званым доме Ромера на цяперашняй Савецкай вуліцы арганізоўвалі свае сустрэчы паўстанцы 1863 года, і маляваў гэты дом Орда, удзельнік паўстанняў 1830–31-га і 1863-га гг., калі ў гэтым доме, так бы мовіць, яшчэ не заціхлі крокі Кастуся Каліноўскага.

Нягледзячы на велізарную каштоўнасць для вывучэння архітэктурнай спадчыны Горадні малюнкі Орды робяць ураджанне не заўсёды дакладных. Бачна, што завяршаў свае эскізы мастак ужо не з натуры, а хутчэй па памяці, таму далёка не заўсёды захоўваецца маштаб будынкаў, некаторыя іх архітэктурныя дэталі. Напрыклад, занадта маленькіх памераў атрымаўся ў Орды бернардынскі касцёл, малюнак фасада палаца Сапегаў (так званай "баторыеўкі") на рагу Карла Маркса таксама не зусім адпавядае рэчаіснасці. Па гэтай прычыне самыя дакладныя – гэта ўсёж такі не каляровыя, а графічныя, эскізнага характару, працы мастака.

Тым не менш, малюнкі Напалеона Орды – невычэрпная крыніца ведаў аб нашым горадзе, іх трэба як мага шырэй прапагандаваць сярод гарадзенцаў (рабіць бігборды, каляровыя шыльды крамаў, аздабляць імі кавярні і г.д.), каб жыхары роднага горада любілі яго больш і больш ведалі яго багатую гісторыю.

---

*Для больш зручнага прагляду ўсе малюнкі Н.Орды падзеленыя на пяць тэматычных груп. Падчас падрыхтоўкі матэрыялу сустракаліся розныя копіі (варыянты) малюнкаў, розных па якасці, памерах, колернасці і г.д., таму некаторыя выявы размешчаны ў некалькіх варыянтах. Кожны малюнак можна праглядзець у павялічаным фармаце (варыянт для друку).*

**Культавыя пабудовы**

Каложская (Барысаглебская) царква. Помнік гарадзенскай архітэктурнай школы XII ст. Мяркуемы будаўнік – Пётр Міланег. Частка фасада была разбурана ў 1853 г. па прычыне апоўзня. На другім плане акварэлі (справа) – будынкі гарадзенскіх замкаў ды вежа пабернардзінскага касцёла Адшукання Святога Крыжа. Акварэль выканана 7 красавіка 186(?)г.









Каложская царква XII ст. Стары замак. Вайсковы шпіталь (былы Новы замак).
Малюнак зроблены з месца, дзе цяпер знаходзіцца новы мост.






Каложская царква XII ст. Стары замак. Вайсковы шпіталь (былы Новы замак). Малюнак выкананы 6 чэрвеня 1866 г. з месца, дзе цяпер знаходзіцца стары мост.





Нёман і выгляд Каложскай царквы з боку апсіды.





**Касцёл Адшукання Святога Крыжа пабернардзінскага мужчынскага кляштара.** Пабудаваны ў 1602–1618 гг. У 1738 г. была ўзведзена званіца, дабудаваная ў 1788 г. мясцовым архітэктарам Ф. Міхалкевічам. У архітэктуры касцёла спалучаюцца элементы готыкі (контрфорсы, стральчатыя аконыя праёмы, нервюры скляпенняў) і барока.





**Комплексы бернардзінскага мужчынскага і жаночага кляштараў.** На першым плане – касцёл бернардынак. Перададзены ў 1854 г. Барысаглебскаму праваслаўнаму манастыру. Цяпер на месцы апошняга – будынак абласнога драматычнага тэатра.





**Дзядзінец былога кляштара езуітаў** (у XIX ст. турма), на другім плане – барочны фасад касцёла даміканскага кляштара XVIII ст.





Дзядзінец былога кляштара езуітаў (у XIX ст. турма), паўночны фасад касцёла Святога Францішка Ксаверыя. Касцёл узведезны ў 1678–1700 гг. на сродкі Самуэля і Канстанцыі Лазовых.



Забудова ўсходняга боку даўняга Рынка. Злева – паезуіцкі касцёл Францішка Ксаверыя з аптэкай, справа – былы палац Сапегаў.







**Старадаўняя нёманская пераправа**, якія функцыянавала ў XV–XVII стст. Была працягам даўняй вуліцы Маставой (Вялікай). Ішла паміж узвышшам, на якім стаяў знішчаны ў XX ст. комплекс бернардынак, і ўзгоркам. на якім ў XVIII ст. быў збудаваны Новы каралеўскі замак. У занёманскай частцы горада – даўні млын (злева) і комплекс францішканскага кляштара XVII–XVIII стст. (справа). Малюнак выкананы 20 верасня 1867 г.





Забудова занёманскага прадмесця і касцёл францішканскага кляштара XVIII ст. (злева), Каложа (справа).



**Царква манастыра базыліянак**, узведзена Юзафам Фантанай III у 1726 г. Злева – ад будынка царквы – вежа Сафійскага сабора (даўняя Фара Вітаўта), справа  – фасад касцёла паезуіцкага кляштара).






**Царква манастыра базыліянак**. Комплекс збудаваны ў 1720–1751 гг. Царква ўзведзена Юзафам Фантанай III у 1726 г.






Яр, якім цячэ Гараднічанка. У левым верхнім куце – будынак сінагогі.
Акварэль выканана 13 жніўня. Год не адзначаны.





**Шэраговая забудова XIX ст.**

---

**Агульная панарама Гародні.** Злева – замкавы комплекс, па сярэдзіне – базіліянскі жаночы манастыр і Сафійскі сабор (былая Фара Вітаўта), справа – фарны (паезуіцкі) і бернардзінскі касцёлы. Паміж апошнім і берагам Нёмана – даўні палац Агінскіх-Сапегаў (цяпер піўзавод).








**Даўні Рынак** (Парадная плошча ў XIX ст.). Злева – гандлёвыя рады, узведзеныя на месцы даўняй ратушы, камяніца Тызенгаўза і вуліца Замкавая, справа – Сафійскі сабор (былая Фара Вітаўта) і забудова паўночнай часткі плошчы.






harodnia.com

**Забудова вуліцы Дамініканскай** (даўняй Віленскай, у XIX ст. таксама называлася Саборнай, цяпер Савецкая). На першым плане злева – гатэль Ромера, справа – даўні шпіталь св. Духа. Акварэль выканана з месца скрыжавання з вуліцай Найдуса 1 ліпеня 1867 г.








**Двор дома Макавельскіх.** Вуліца Скаліманаўская (цяпер Гараднічанская)



Драўляная забудова цэнтральнай часткі горада





**Дом Баркоўскага** (1803-1871, магчыма генерал-маёра расійскай арміі), жыллё вайсковага начальніка Левандоўскага. Гародня. 23 мая 1867 г.



**Уезд у горад**. Акварэль выканана 4 жніўня 1866 г.



**Рэгулярная драўляная забудова Занёманскага фарштадта** Гародні другой паловы XIX ст. На другім плане – чыгуначны мост і вежа касцёла бернардзінцаў.





**Забудова занёманскага прадмесця.** На другім плане – чыгуначны мост і палац Мураўскага (былы будынак тонкасуконнага камбіната).



---

**Драўляная забудова гарадскіх прадмесцяў** на беразе Нёмана.





**Архітэктура XVIII ст.**

**Аўгустовак**. Загарадная каралеўская рэзідэнцыя. Назва сядзібы паходзіць ад аднаго з імёнаў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, узведзеная ў 70-х гадах XVIII ст. Мяркуецца, што аўтарам праекта палаца быў Джузэпе Сака. У XIX ст. сядзіба належала роду О'Брыен дэ Лясых. Палац разбураны рускімі войскамі падчас адступлення ў перыяд першай сусветнай вайны. Знаходзіўся каля цяперашняга канечнага прыпынка па вул. Рэпіна. Акварэль выканана 27 ліпеня. Год не адзначаны.





**Швейцарская даліна і дваравы (усходні) фасад палаца Тызенгаўза XVIII ст**. Пабудаваны ў 60-70-х гадах XVIII ст. Ю. Мёзарам і Дж. Сака. Збураны падчас першай сусветнай вайны.








**Палац віцэ-адміністратара**. Узведзены ў 1793 г. Класіцызм. У XIX ст. належаў Міхалу Валіцкаму, а з 1842 г. - праваслаўнаму духавенству.








**Будынак Медычнай акадэміі XVIII ст.** У XIX ст. палац Чацвярцінскіх (цяпер ваенная камендатура на вуліцы Ажэшка). Акварэль выканана 28 ліпеня. Год не адзначаны.





**Сядзіба Станіславова XVIII ст**. У XIX ст. належала Любэцкім.
Акварэль выканана 28 ліпеня. Год не адзначаны.








**Сядзіба Панямунь.** Рэзідэнцыя караля Станіслава Аўгуста, узведзена ў 70-я гады XVIII ст. Архітэктар Ю. Аляхновіч. У XIX ст. належала Ляхніцкім.







**Замкі**

---

**Новы замак.**

Справа, на занёманскім прадмесці – будынак сінагогі, узведзенай у XVIII ст.







**Стары замак з боку сутокі Нёмана і Гараднічанкі**.
Акварэль выканана 1 ліпеня. Год не адзначаны.





**Помнікі грамадскага прызначэння**

**Чыгуначны мост на Нёмане** Варшаўска-Пецярбургскай чыгункі быў пабудаваны пад кірункам французскага інжынера Каліньёна (Collignona). На першым плане – паромны мост, які функцыянаваў яшчэ ў XVIII ст.






**Чыгуначны вакзал**. Акварэль выканана 15 чэрвеня 1867 г.


38
15 Juni 1867.
Grodno Bahnhof


harodnia.com